Беларусь.info
№103 18/08/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Улады спрабуюць зьліквідаваць структуры ПКБ.** Партыя камуністаў (Беларуская), якую ачольвае Сяргей Калякін, аказалася пад пагрозай закрыцьця. З упраўленьня юстыцыі Менскага гарвыканкаму прыйшло паведамленьне пра ліквідацыю сталічных філіяў партыі. Адсутнасьць у Менску зарэгістраваных суполак дазваляе ў рамках закону зьліквідаваць усю партыю.

**У рэгіёнах чыняць ціск на сяброў СПБ на чале з А.Борыс.** Кіраўніцтва не прызнаванага афіцыйным Менскам кіраўніцтва Саюзу палякаў Беларусі заяўляе аб тым, што ў розных рэгіёнах Беларусі пачаўся ціск на сяброў Галоўнай рады СПБ – на заўтра ў Горадні прызначана паседжаньне гэтага органу, які кіруе арганізацыяй паміж зьездамі.

**Гарадзенцаў высяляюць з Новага Сьвету.** У Горадні гэтымі днямі жыхароў прыватных дамоў побач з цэнтрам прымусам перасяляюць у спальны раён у шматпавярховы дом. Улады пачынаюць руйнаваць квартал прыватнай забудовы, які называецца Новым Сьветам. Учора адбылося паседжаньне грамадзкага прэс-клюбу, на якім некаторыя гарадзенскія гісторыкі спрабавалі прыцягнуць увагу людзей да разбурэньня гістарычнай забудовы.

# Факты

**Цана на газ для Беларусі падвысіцца ўтрая.** Пасьля саміту ў Сочы лідэраў краін Эўрапейска-азіяцкай эканамічнай супольнасьці – ЭўрАзЭС – расейскі “Газпром” дэманструе непахіснасьць сваёй пазыцыі адносна падвышэньня цэнаў на газ для Беларусі. “Газпром” нагадвае, што цана на газ для Беларусі падвысіцца ўтрая, а, магчыма, і – больш.

**Камунальныя плацяжы істотна вырастуць.** Першы віцэ-прэм'ер беларускага ўраду Уладзімер Сямашка прагназуе рост платы за камунальныя паслугі. Выступаючы на паседжаньні нацыянальнага Савету па працоўных і сацыяльных пытаньнях, Сямашка сказаў, што паводле разьлікаў спэцыялістаў, калі цана на газ падвысіцца да 100 даляраў за тысячу кубамэтраў, камунальныя плацяжы за двухпакаёвую кватэру, у якой пражывае сям'я з чатырох чалавек, вырастуць прыкладна на 35 даляраў.

**Пінскі гарсавет адзіны ў Беларусі асудзіў у 91-м путч.** Пінск быў адзіным горадам у Беларусі, а, магчыма, і ва ўсім тагачасным СССР, дзе гарадзкі савет у часе надзвычайнай сэсіі ўхваліў заяву, у якой путч 19 жніўня 1991 году асуджаўся і быў названы антыканстытуцыйным.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org